**МУ́РАМЦАЎ** Ілья Аляксеевіч (2.8.1901, с. Кірушкіна Бугурусланскага р-на Арэнбургскай вобл., Расія — 8.8.1968), артыст оперы (бас). Засл. арт. Беларусі (1938). Вучыўся ў Ленінградскім муз. тэхнікуме і на оперных курсах (1923—30). У 1933—41 і 1942—52 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі (у 1941—42 у Вял. т-ры ў Маскве; удзельнік франтавых канцэртных брыгад). Валодаў голасам прыгожага тэмбру. Творчай індывідуальнасці спевака найб. адпавядалі партыі характарнага (у т.л. камедыйнага) плана. У нац. операх стварыў вобразы Тараса («У пушчах Палесся» А.Багатырова), Анішчука і Данілы («Міхась Падгорны» і «Алеся» Я.Цікоцкага). З інш. партый на бел. сцэне: Галіцкі, Канчак («Князь Ігар» А.Барадзіна), Чуб («Чаравічкі» П.Чайкоўскага), Стары цыган («Алека» С.Рахманінава), Сабакін («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Лісніцкі («Ціхі Дон» І.Дзяржынскага), Дон Базіліо («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Мефістофель («Фауст» Ш.Гуно). У 1952—68 саліст Башкірскага т-ра оперы і балета.

*Б.С.Смольскі.*



*І.А.* ***Мурамцаў.***

**МУРА́НСКАЯ** Надзея Мацвееўна, артыстка оперы (сапрана) і педагог 2-й пал. 19 ст. Скончыла Пецярбургскую кансерваторыю па класе К.Эверардзі. Працавала ў Казані, Вільні, Пецярбургу (у прыватнай оперы). Выступала ў Мінску з гастрольнымі трупамі на сцэне Мінскага гар. т-ра (у 1890—93 і 1902/03) у партыях Маргарыты («Фауст» Ш.Гуно), Тамары («Дэман» А.Рубінштэйна), Таццяны («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Антаніды («Іван Сусанін» М.Глінкі), каралевы Маргарыты («Гугеноты» Дж. Меербера), Наташы («Русалка» А.Даргамыжскага), Лакмэ («Лакмэ» Л.Дэліба), Машы («Дуброўскі» Э.Напраўніка), карысталася значным поспехам. Рэцэнзенты адзначалі мяккае гучанне яе сапрана, тонкую музыкальнасць, добрую вакальную школу, моцную драм. ігру, выключнае пачуццё ансамбля. Лепшай у яе рэпертуары была партыя донны Анны («Дон Жуан» В.А.Моцарта), у якой М. выступіла ў Мінску на вечары, прысвечаным 100-годдзю з дня смерці Моцарта. Арганізавала Мінскую вакальную студыю.

*Літ.:* Музыкальный театр Белоруссии: Дооктябрьский период. Мн., 1990. С. 336—339.

*В.П.Пракапцова.*



*М.П.* ***Мусаргскі.***

**МУ́САРГСКІ** Мадэст Пятровіч (21.3.1839, с. Карава Кунінскага р-на Пскоўскай вобл., Расія — 28.3.1881), рускі кампазітар. Кампазіцыі вучыўся ў М.Балакірава. Удзельнік «Магутнай кучкі». У ранніх творах 1-й пал. 1860-х гадоў (музыка да трагедыі Сафокла «Цар Эдып», опера «Саламбо» паводле Г.Флабера) імкнуўся дынамізаваць масавыя сцэны. Камічная опера «Жаніцьба» паводле М.Гогаля (1868, няскончана; дапісана і аркестравана М.Іпалітавым-Іванавым, 1931) — спроба ўвасобіць драм. прозу ў музыцы, развіць рэчытатыўна-дэкламацыйны бок оперы. Вяршыня творчасці М. — нар.-гіст. муз. драмы *«Барыс Гадуноў»* паводле А.Пушкіна і М.Карамзіна (1869, паст. 1874) і *«Хаваншчына»* (няскончана; завершана М.Рымскім-Корсакавым, паст. 1886). На сцэне Нац. акад. т-ра оперы Беларусі прэм'ера спектакля «Барыс Гадуноў» адбылася ў 1954, 1974 і 2001, «Хаваншчыны» — у 1970. Творы М. ўвайшлі ў скарбніцу сусв. муз. культуры, зрабілі вял. ўплыў на музыку 20 ст.

*Літ.:* Щ е р б а к о в а Т.А. Споры и искания: Из истории «Бориса Годунова» М.Мусоргского. Мн., 1971; Н и с н е в и ч И.Г. Мусоргский и его опера «Борис Годунов». Мн., 1975.

*Т.Г.Мдывані.*

**МУ́ШПЕРТ** Генадзь Уладзіміравіч (н. 25.3.1954, Мінск), рэжысёр. Скончыў Ленінградскі ін-т т-ра, музыкі і кінематаграфіі (1975), Бел. тэатр.-маст. ін-т (1982). З 1982 рэжысёр Бел. т-ра імя Я.Коласа, з 1988 — Латв. маладзёжнага т-ра, з 1994 — Гродзенскага абл. драм. т-ра (у 1995—98 гал. рэжысёр). Яго пастановачнай і маст. манеры ўласціва тэндэнцыя да сцвярджэння маральных каштоўнасцей, духоўнай вышыні і высакароднасці, любові да бліжняга, здольнасці да спачування, павагі да чалавека. Гал. на сцэне лічыць змест, але адначасова па-мастацку вобразна, пазбягаючы паўтораў, вядзе пошук сучасных форм падачы матэрыялу, яркіх мізансцэн, смела ўводзіць пластычны і муз. малюнак як неабходны элемент сцэнічнага дзеяння. Сярод пастановак: у т-ры імя Я.Коласа — «Адпачынак пасля ранення» паводле В.Кандрацьева (1982), «Каманда» С.Злотнікава (1983), «Чужы» Л.Ніканенкі (1984), «Маскоўскія канікулы» А.Кузняцова (1985); у Гродзенскім т-ры — «Дацкая гісторыя» А.Шапіры паводле Х.К.Андэрсена, «Дарагая Памэла» Дж. Патрыка, «Гуляем у Маршака» паводле твораў С.Маршака (усе 1994), «Камедыя пра нешчаслівага селяніна, яго жонку Маланку, жыда Давіда і Чорта, які страціў сэнс існавання» У.Рудава паводле К.Марашэўскага і Ф.Аляхновіча, «Аднойчы ў Канзасе» С.Дзмітрыева, «Чатыры навелы пра каханне» Р.Горына, Л.Петрушэўскай, Злотнікава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ